# НЕ «КОЦІК» – КОТ!

## Від, які лічыўся з 1927 года вымерлым у Беларусі, з'явіўся ў запаведніку

**Паведамленне з'явілася на сайце «Дзікая прырода Беларусі». Больш падрабязна аб гэтай навіне расказвае грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ).**

Як паведаміў старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі малекулярнай заалогіі НАН Беларусі па біярэсурсах Валерый ДАМБРОЎСКІ, лясны кот сфатаграфаваны на аўтаматычную камеру ў Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведніку ў былым населеным пункце Ражава (Нараўлянскі раён). Нягледзячы на нізкую якасць начной здымкі, на фота добра бачныя асноўныя вызначальныя прыкметы віду: буйны памер, доўгая задняя ступня і масіўны хвост з пяццю выразнымі чорнымі палосамі. Лясны кот мае падобныя з янотападобным сабакам даўжыню цела і вышыню ў карку, толькі крыху саступаючы па гэтых параметрах лісіцы. Гэты від у Беларусі лічыўся вымерлым. Апошняя асобіна была здабыта зімой 1927 года ў Барысаўскім раёне Мінскай вобласці.

Правільнасць вызначэння віду, знятага на камеру, была пацверджана двума вядомымі украінскімі тэрыелагамі. «Можна сказаць, што пасля 90 гадоў сваёй адсутнасці лясны кот вярнуўся на беларускую зямлю. Будзем спадзявацца, што гэта не вандроўная адзінкавая асобіна і з'яўленне яе ў запаведніку не выпадковасць, як не было выпадковасцю з'яўленне там жа рысі, мядзведзя і многіх іншых відаў, якія прайшлі свой шлях ад першай рэгістрацыі ў запаведніку да стварэння ўстойлівых лакальных груповак», — сказаў Валерый Дамброўскі.

Для выратавання ляснога ката ў Германіі ў канцы XX стагоддзя паспяхова былі праведзены работы па яго рэінтрадукцыі. Дзякуючы гэтаму, а можа, з-за нейкіх унутрыпапуляцыйных прычын, колькасць віду пачала лакальна расці. Так, лясны кот стаў з'яўляцца ў Нідэрландах і Аўстрыі, павялічылася яго колькасць у Францыі, Швейцарыі і Закарпацці. Ва Украіне ў апошнія дзесяцігоддзі канстатавана экспансія віду на ўсход. Па сучасных звестках, лясны кот адзначаецца ўжо далёка за межамі яго прывычнага карпацкага арэалу — па ўсёй лесастэпавай зоне Украіны аж да левабярэжжа Дняпра. Верагодна, гэты рух ляснога ката на ўсход закрануў і Беларусь.

**Лясны кот (Felis silvestris)** — дзікая жывёла, некалі шырока распаўсюджаная ў лісцевых і змешаных лясах Еўропы. Ён адрозніваецца ад свайго найбліжэйшага суродзіча — свойскага ката — буйнымі памерамі, дзікім норавам і нелюдзімасцю. Акрамя агульных памераў, найбольш важнымі знешнімі прыкметамі лічацца вялікая даўжыня задняй ступні, наяўнасць чорных плям на ўнутраным баку лап, форма і афарбоўка хваста: у ляснога ката ён шырокі, тупы, як бы абсечаны на канцы.

**Сяргей Куркач**

**Источник:** Звязда. — 2017. — № 210 (31 кастрычніка). — С. 3.